*В.У. Чараўко, кандыдат гістарычных навук, дацэнт*
*Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай, г. Полацк*
*viktar.charauko@gmail.com*

# АРХЕАЛАГІЧНАЯ ЭКСПЕДЫЦЫЯ ЯК СРОДАК АКТУАЛІЗАЦЫІ ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ (З ВОПЫТУ ЭКСПЕДЫЦЫЙ ПОЛАЦКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА)[3]

Гістарычная памяць, якая з'яўляецца неад'емным элементам светапогляду, у значнай ступені вызначае каштоўнасныя арыенціры грамадства. Яна дазваляе падтрымліваць сувязь сучаснага і мінулага, знітоўвае нас з нашымі продкамі. Праз гэта актуалізацыя гістарычнай памяці, яе перадача паміж пакаленнямі спрыяе кансалідацыі сучаснага грамадства на агульным падмурку гістарычнай спадчыны і нацыянальных традыцый. Як этнадыферэнцыруючая прыкмета, гістарычная памяць выступае неад'емнай умовай захавання нацыянальнай самасвядомасці.

Зберажэнне гістарычнай памяці мае некалькі вымярэнняў – ад дзяржаўнай палітыкі і мэтанакіраваных высілкаў адпаведных устаноў і грамадскіх арганізацый да асабіста-сямейнага, калі трансляцыя памяці аб падзеях мінулага, усвядомленых праз прызму ўспрыняцца і вопыту кожнага асобнага чалавека, адбываецца «стыхійна», праз традыцыйныя інстытуты сям'і і дамашняга выхавання. Такая шматпланавасць і рознаўзроўневасць забяспечвае надзейнасць і эфектыўнасць захавання і перадачы гістарычнай памяці. Гэта бачна на прыкладзе гістарычнай памяці аб жудасных падзеях Вялікай Айчыннай вайны.

На сучасным этапе важнае месца ў справе зберажэння і перадачы гістарычнай памяці належыць сістэме адукацыі і – шырэй – асветы. На гэта скіраваны і павінен быць скіраваны змест гуманітарных дысцыплін, якія выкладаюцца ў розных навучальных установах, – ад школы да ўніверсітэта.

Асаблівай увагі заслугоўвае актуалізацыя гістарычнай памяці ў свядомасці студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей (далей – студэнтаў-гісторыкаў). У адрозненне ад навучэнцаў большасці іншых спецыяльнасцей, якія павінны засвоіць базавыя гістарычныя факты, будучыя гісторыкі рыхтуюцца да прафесійнай дзейнасці настаўнікаў, выкладчыкаў, даследчыкаў, музейных спецыялістаў. Гэтыя ролі прадугледжваюць не толькі веданне і трансляцыю багатага факталагічнага матэрыялу (дат, падзей, персаналій), але і раскрыццё яго аксіялагічнага патэнцыялу, абуджэнне і актуалізацыю гістарычнай памяці ў новых пакаленняў навучэнцаў. Студэнты-гісторыкі мусяць быць падрыхтаванымі і да навуковага пошуку, вынікам якога стане атрыманне новых гістарычных ведаў і, адпаведна, адкрыццё новых магчымасцей для культывавання гістарычнай памяці.

Дзейсным сродкам актуалізацыі гістарычнай памяці студэнтаў-гісторыкаў з'яўляецца археалагічная экспедыцыя. Яна арыентавана на паглыбленне і практычнае засваенне тэарэтычных ведаў, атрыманых у выніку вывучэння дысцыпліны «Археалогія», азнаямленне студэнтаў з правіламі, методыкай і прыёмамі правядзення раскопак археалагічных помнікаў, складання палявой дакументацыі. Паколькі пры гэтым даследуюцца матэрыяльныя аб'екты, створаныя людзьмі мінулага і археалагізаваныя ў выніку канкрэтных гістарычных падзей і працэсаў, далучэнне студэнтаў да палявых даследаванняў мае комплексны эфект. Яно садзейнічае паглыбленню ведаў удзельнікаў экспедыцыі аб мінулым, пашырэнню кругагляду, фарміраванню

[3] Работа выканана ў межах праекта Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў «Пахавальныя помнікі Полацка XI–XVIII стст. у кантэксце развіцця сінхронных некропалей Беларускага Падзвіння: пахавальны абрад, інвентар, палеаантрапалагічная характарыстыка» (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20221071 ад 06.07.2022).

асаблівых, эмацыйна афарбаваных адносін да абставін, пры якіх існаваў даследаваны археалагічны аб’ект.

У час археалагічных экспедыцый студэнты атрымліваюць не загадзя падрыхтаваную інфармацыю з падручнікаў, а ў якасці даследчыкаў ўдзельнічаюць у яе здабыцці. Такі фармат з’яўляецца больш складаным, але і больш прадуктыўным. Да таго ж удзельнікі экспедыцый на некалькі тыдняў вырываюцца са звыклага асяроддзя. Яны змяняюць кола і фармат камунікацыі, не карыстаюцца камп’ютарам, мінімізуюць карыстанне смартфонам, жывуць у намётах, самастойна гатуюць ежу на вогнішчы, амаль увесь час праводзяць на свежым паветры і шмат фізічна працуюць. Для сярэднестатыстычнага сучаснага студэнта пералічаныя ўмовы з’яўляюцца эўстрэсавымі – стрэсавымі са станоўчым эфектам.

Гэта спрыяе больш эмацыйна афарбаванаму, больш яркаму ўспрыняццю інфармацыі, якая дзякуючы эмацыйнай складаючай засвойваецца лепш. Таму што гістарычная памяць – гэта не толькі веды аб мінулым, але і шырокая гама эмоцый і пачуццяў: ад спачування ахвярам войнаў за іх пакуты да гонару за абаронцаў Айчыны за іх мужнасць, ад павагі да нашых продкаў за стойкасць да удзячнасці ім за трываласць, ад захаплення выбітнымі гістарычнымі дзеячамі да ўсведамлення і прыняцця простага факту, што аб большасці нашых папярэднікаў мы не ведаем нічога, нават іх імя.

Археалагічная экспедыцыя дазваляе лепш адчуць, зразумець людзей мінулага. Жыццё сучаснага чалавека звязана з тэкстам, з магчымасцю зафіксаваць усе падзеі і прывязаць іх да дакладных ча́савых і прасторавых каардынат. У традыцыйным грамадстве – на працягу большай часткі гісторыі чалавецтва – панаваў іншы, фальклорны механізм зберажэння і трансляцыі інфармацыі. Экстраардынарныя і крытычныя для вясковай грамады гістарычныя падзеі мемарыялізаваліся пры дапамозе элементаў ландшафту, якім надаваўся дадатковы сімвалічны статус. У ролі такіх маркёраў маглі выступаць і археалагічныя помнікі: курганы, гарадзішчы, жальнікі Маркёрамі маглі быць аб’екты прыроднага або антрапагеннага паходжання [1, с. 3; 2, с. 432–433, 436; 3, с. 91]. Аб устойлівасці такога спосабу перадачы гістарычнай памяці сведчыць трываласць матэрыяльнай і духоўнай культуры, народных абрадаў і традыцый.

Прычынай спецыфічнага ўспрыняцця археалагічных помнікаў быў пануючы ў дапісьмовым грамадстве фальклорны механізм захавання і перадачы інфармацыі.

Надзвычай устойлівым з’яўляецца пахавальны абрад, які трывалы да нязначных зменаў рэлігійнага, сацыяльнага, культурнага жыцця і змяняецца толькі пад уплывам маштабных працэсаў. Прыкладам можа служыць пахавальная практыка, існаваўшая на тэрыторыі Беларускага Падзвіння ў эпоху позняга сярэднявечча – ранняга новага часу. Яе існаванне не перапынілі шматлікія войны, эпідэміі і галодныя гады XVI–XVIII стст. [4, с. 267]. Найбольш адметнымі рысамі пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння позняга сярэднявечча – ранняга новага часу з’яўляюцца каменныя намагільныя канструкцыі і прысутнасць фрагментаў керамікі – рэшткаў памінальнага інвентару [5, с. 161].

З 2010 г. студэнты-гісторыкі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта пад кіраўніцтвам аўтара праводзілі палявыя даследаванні на некропалях на тэрыторыі Бешанковіцкага, Гарадоцкага, Глыбоцкага, Докшыцкага, Лёзненскага, Полацкага, Шумілінскага раёнаў. Удзел у раскопках і разведках прымалі студэнты дзённай і завочнай форм навучання, першакурснікі і «ветэраны» экспедыцый, практыканты і валанцёры. Некалькі ўдзельнікаў археалагічных экспедыцый з ліку старшакласнікаў неўзабаве самі сталі студэнтамі-гісторыкамі.

Адным з вынікаў гэтых археалагічных даследаванняў стала выяўленне ў верхніх умоўных пластах культурнага слою могільнікаў фрагментаў керамікі. Яна сведчыць аб рытуальным спажыванні ежы на могілках –памінальным абрадзе. Гэта суадносіцца з этнаграфічна зафіксаванымі абрадамі «прыкладзінаў», «трацінаў», а таксама такімі святамі беларускага народнага календара, як Дзяды і Радаўніца. Знойдзеная кераміка дазволіла археалагічна пацвердзіць, што памінальны абрад беларусаў, этнаграфічна апісаны ў XIX–XXI стст., існаваў на

Беларускім Падзвінні ужо ў XV–XVI стст. [5, с. 161]. Трывалая і жывая народная традыцыя атрымала пацвярджэнне свайго даўняга існавання дзякуючы руплівай працы ўдзельнікаў археалагічных экспедыцый.

Такім чынам, археалагічная экспедыцыя з'яўляецца дзейсным сродкам развіцця светапогляду студэнтаў-гісторыкаў. Яна дазваляе непасрэдна дазнацца аб матэрыяльнай і, ускосна, аб духоўнай культуры нашых продкаў. Гэта, а таксама удзел у палявых даследаваннях, непасрэднае здабыванне археалагічных крыніц, асаблівы эмацыйны фон палявой экспедыцыі ствараюць спрыяльныя ўмовы для актуалізацыі гістарычнай памяці. Удзел у археалагічных экспедыцыях мае і адтэрмінаваны эфект – успаміны аб іх у кожны раз актуалізуюць памяць пра даследаваныя аб'екты матэрыяльнай культуры – часцінку нацыянальнай гістарычнай спадчыны.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Лобач, У.А. Курганы і гарадзішчы ў міфапаэтычнай карціне свету беларусаў / У.А. Лобач // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные наукі. – 2007. – № 7. – С. 2–11.

2. Лобач, У.А. Міф. Прастора. Чалавек: традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай перспектыве / У.А. Лобач. – Мінск : Тэхналогія, 2013. – 510 с.

3. Чараўко, В.У. «Народная археалогія» і данавуковыя ўяўленні аб пахавальных помніках Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стагоддзяў / В.У. / Чараўко // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2020. – Вып. 31. – С. 91–97.

4. Дук, Д.У. Археалагічныя раскопкі на грунтовым могільніку Туржэц 2 Полацкага раёна / Д.У. Дук // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2008. – № 15. – С. 261–269.

5. Чараўко, В.У. Кераміка познесярэднявечнага могільніка Доўгае як сведчанне памінальнага абраду / В.У. Чараўко // Из истории науки Беларуси: к 25-летию исторического факультета БрГУ имени А.С. Пушкина: сб. материалов Международной научно-практической конференции, Брест, 25–26 ноября 2016 г.: в 2 ч. / редкол.: Е.А. Бурик [и др.]. – Брест, 2018. – Ч. 1. – С. 160–163.

*О.В. Шевченко, кандидат философских наук, доцент,*
*Финансовый университет при Правительстве Российской Федерации,*
*г. Москва,*
*e-mail: OVShevchenko@fa.ru*

# ОСОБЕННОСТИ ПРЕЕМСТВЕННОСТИ ДУХОВНОГО ОПЫТА ПОКОЛЕНИЙ

Проблема преемственности духовного опыта поколений приобрела особую актуальность в современной действительности. Обращение к духовным основам жизни общества связано с потребностью осознания места и роли России в мировой цивилизации, а также необходимостью сохранения традиционных духовно-нравственных ценностей под натиском либеральных, активно навязываемых западной псевдодемократией. Фундаментальные вызовы глобализации обращены ко всему российскому обществу, его культурно-историческим традициям, традиционным вероисповеданиям и национальной идентичности.

В этой связи представляется, что главное внимание в рамках рассмотрения преемственности должно быть обращено на трансляцию социокультурного опыта в образовательный процесс. Духовный суверенитет в значительной степени зависит от развитого самосознания подрастающего поколения, от их готовности участвовать в созидательной деятельности и защите своей Родины.